# *Спявалі ўланы*

## *(народная балада XVII-XVIII стст.)*

*словы і музыка народныя*




*У правай ручэньцы*
*Ды коняў вядучы*
*А з левага боку*
*Ды шаблі нясучы*
*А з левага боку*
*Ды шаблі нясучы*

*За імі ды войска*
*Як мак, як мак цвіце*
*За імі ды кулі*
*Як дождж, як дождж ідзе*
*За імі ды кулі*
*Як дождж, як дождж ідзе*

*За імі ды стрэльбы*
*Усе зараджалі*
*Далятталі кулі,*
*Але іх міналі*
*Далятталі кулі,*
*Але іх міналі*

*Ехалі ўсё поле*
*А потым другое*
*На трэцяе поле*
*Заездажное*
*На трэцяе поле*
*Заездажное*

*Жаўнер у тым полі*
*Параненны ляжыць*
*Параненны ляжыць*
*Ды востры меч дзяржыць*
*Параненны ляжыць*
*Ды востры меч дзяржыць*

*Ўся моцна галова*
*Яго пабітая*
*Ўся моцна ягона*
*Грудзь паколатая*
*Ўся моцна ягона*
*Грудзь паколатая*

*У правай ды руцэ*
*Каня свайго дзяржыць*
*У левай ды руцэ*
*Ў яго сокал сядзіць*
*У левай ды руцэ*
*Ў яго сокал сядзіць*

*Ля галавы воран*
*Ды воран там крача*
*Ў нагах ды ягоных*
*Ўсё сівы конь скача*
*Ў нагах ды ягоных*
*Ўсё сівы конь скача*

*Пайдзі ж ты мой коню*
*Да маёй староны*
*Скажы ж ты мой коню*
*Айцу й маці маёй*
*Скажы ж ты мой коню*
*Айцу й маці маёй*

*Скажы толькі коню*
*Не ранены ляжу*
*А скажы ж мой коню*
*Што жанаты хаджу*
*А скажы ж мой коню*
*Што жанаты хаджу*

*Мяне ажаніла*
*Ды куля быстрая*
*Мяне абвянчала*
*Ды шабля вострая*
*Мяне абвянчала*
*Ды шабля вострая*

*Спявалі ўланы*
*З паходу ідучы*
*З паходу ідучы*
*Ды маршыруючы*
*З паходу ідучы*
*Ды маршыруючы*

© Stary Olsa